*Власюк Ю. Л., Гладышчук А. А.*

# Бастыённы замак Берасця другой паловы XVII — першай паловы XIX ст.



Берасцейскі замак — адна з самых старажытных фартэцый на Беларусі (яго першае згадванне адносіцца да 1182 г.[1]). Ён гарманічна развіваўся з часу першай сваёй згадкі да сярэдзіны XVII ст., калі цалкам змяніў сваё аблічча. Адбылося гэта з прычыны разбуральных руска-польскай і польска-шведскай войнаў. Пасля іх замак, разбураны і практычна страціўшы свае абарончыя функцыі, меў патрэбу ў больш хуткім аднаўленні.

Трэба адзначыць, што калі перыяд замкавай гісторыі да сярэдзіны XVII ст. зараз даследуецца больш-менш актыўна, то таго ж нельга сказаць пра перыяд другой паловы XVII — першай паловы XIX ст. — замак пасля разбуральных войнаў сярэдзіны XVII ст. ужо ніколі не вяртаў сабе былой велічы і славы. Але гэта не памяншае яго гістарычнай значнасці як аб'екта для даследавання. Менавіта таму дадзены артыкул прысвечаны «бастыённаму» перыяду ў гісторыі Берасцейскага замка.

Галоўнымі фартыфікацыйнымі аб'ектамі замка да сярэдзіны XVI ст. былі 5 вежаў і сцены-гародні паміж імі. Але такое становішча не магло заставацца заўсёды: прыйшоў час, калі тон задавала гарматная

1 «Великая хроника» о Польше, Руси и их соседях XI—XIII вв. М., 1987. С. 122.

артылерыя, якая не шкадавала сярэднявечныя ўмацаванні. У Еўропе гэта зразумелі яшчэ ў XVI ст. — у выніку былі вынайдзены новыя фартыфікацыйныя формы — бастыёны. Таму перабудова Берасцейскага замка заставалася справай часу. Патрабавалася толькі важкая падстава — і яна была дадзена ў распачатых у сярэдзіне XVII ст. войнах. Пасля таго, як замак адчуў на сабе ваенныя дзеянні, яго вырашылі ўмацаваць у адпаведнасці з новымі тэндэнцыямі фартыфікацыі.

Пачалося ўсё з таго, што ў 1648 г. Брэст захапілі запарожскія казакі. У тым жа годзе каралеўскія наёмныя салдаты горад вярнулі. У выніку гэтых падзей Варшаўскі сейм прыняў у 1654 г. спецыяльную дэкларацыю пра тэрміновае аднаўленне ўмацаванняў[2]. У Брэст быў накіраваны інжынер, работы павінны былі пачацца не пазней 1655 г. Інжынерам з'яўляўся польскі падданы італьянскага паходжання — Якаб Банэлі. Ён склаў план задуманых умацаванняў у Берасці (у 1657 г. з плана была зроблена копія, пра што паказвае захаваны на ёй надпіс: *«выкананы польскім інжынерам Банэлі да ўзяцця (горада)...»*)[3].

Горад, у адпаведнасці з планам, з поўначы павінен быў атрымаць магутны абарончы бастыённы пояс. Замак жа планавалася стварыць альбо ў выглядзе чатырохкутнага, альбо пентаганальнага бастыённага ўмацавання[4].

Аднак ва ўмовах, калі разгарэліся войны, будаўніцтва замка ішло млява. У траўні 1657 г. да горада наблізілася шведска-трансільванская армія. Праз некаторы час, 13 траўня, горад капітуляваў[5]. Ён здаўся практычна без супраціву.

Падчас свайго знаходжання ў горадзе шведы склалі яго планы[6], якія ілюструюць тагачасны стан і меркаванае размяшчэнне незбудаваных Банэлі ўмацаванняў. Дакладней, новыя ўмацаванні збудаваныя былі, але яны не адпавядалі першапачатковаму плану. Так, што тычыцца

2 *Ткачев М. А.* Замки Беларуси. Минск, 2007. С. 29.

3 Еще одна страница истории Бреста. Из шведских архивов 355 лет спустя... История [Электронный ресурс] // Брестский Курьер. URL: http://www.bk-brest.by/2012/07/4103/ (дата обращения: 20.09.2015).

4 Берасьце (J. Bonelli, 1657) [Электронный ресурс] // Википедия. Свободная энциклопедия. URL: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Bieraście.Берасьце(J. Bonelli,_1657).jpg (дата обращения: 23.04.2015).

5 *Никитчик А. Д., Никитчик Т. А.* Берестейский кроссворд Э. Й. Дальберга — гравюра «Urbsetcastellum» // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. 2012. № 6. С. 81.

6 Берасьце (E. Dahlbergh, 1657) [Электронный ресурс] // Википедия. Свободная энциклопедия. URL: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Bieraście.Берасьце_(E._Dahlbergh,_1657).jpg (дата обращения: 23.04.2015).

замка, то з яго паўднёва-ўсходняга боку з'явіўся земляны бастыённы пояс (ад двух да трох бастыёнаў), агароджаны ровам. Акрамя таго, асобныя бастыёны з'яўляюцца ў заходнім і ўсходнім кутах замка.

Пасля сыходу з горада шведаў, застаўся трансільванскі камендант А. Гаўдзі, які 26 траўня заклікаў жыхароў Берасцейскай і Кобрынскай эканомій працягваць працу па ўзвядзенні валоў на яшчэ недабудаваным замку. Скончыць працу Гаўдзі хацеў за кароткі тэрмін — да 10 чэрвеня. Аднак невядома, што за гэты час удалося выканаць[7].

Пасля вяртання горада да Рэчы Паспалітай (у жніўні 1657 г.) ужо ў наступным годзе сейм прымае пастанову аб працягу работ у горадзе (і для гэтага вылучыў 10 тыс. злотых[8]). Аднак гэтае рашэнне — ужо сёмае па ліку — за тры гады не было выканана. У 1659 г. прымаецца чарговае рашэнне па поўным абвалаванні замка.

Зімой 1659—1660 гг. рускі ваявода Хаванскі ажыццяўляў паход, накіраваны на Варшаву, у якім Берасцейскаму замку была адведзена роля апорнага палітычнага і ваеннага цэнтра. 8 студзеня 1660 г. горад быў захоплены, а ў ноч на 13 студзеня 1660 г. таксама быў захоплены і замак[9]. Хаванскі знішчыў усіх абаронцаў і пасадзіў свой гарнізон. Ён пісаў у данясенні да цара: «*А Брестъ верхней город укрепил я накрепко; сверх старых крепостей по земляному городу нарубил тарасы, в 2 стены рублены, а вышеною 2 саженя, а в иных местах и в 2¹/2*»[10]. З прыведзенага тэксту вынікае, што рускія працягвалі праводзіць у замку фартыфікацыйныя працы. Пакінулі горад войскі Хаванскага 24 снежня 1660 г.[11]

У замку пры гэтым заставалася вельмі шмат маёмасці, што здзівіла Яна Казіміра, які загадаў Францішку Былінскаму скласці «Інвентар фартэцыі берасцейскай»[12]. Той знайшоў у замку больш за 60 гармат, порах, амуніцыю, збожжа і больш за 100 бочак солі, перамешчаных, мабыць, з Берасцейскага «солного шпіхлера». Акрамя таго, у замку размяшчалася больш за сотню розных будынкаў, многія з якіх былі перанесены туды з горада. Цікавасць уяўляе апісанне збудаваных на

7 *Никитчик А. Д., Никитчик Т. А.* Указ. соч.

8 *Ткачев М. А.* Указ. соч. С. 31.

9 *Гладыщук А. А., Никитчик А. Д.* Инвентари Берестейского замка и города после 1660 года // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. 2013. № 6. С. 42.

10 Акты Московского государства. Т. 3. Разрядный приказ. Московский стол, 1660—1664 гг. СПб., 1901. С. 57.

11 *Гладыщук А. А., Никитчик А. Д.* Указ. соч. С. 43.

12 Там же. С. 43.

вале драўляных умацаванняў[13]. Па ўсёй бачнасці, менавіта пра гэтыя ўмацаванні і пісаў у свой час Хаванскі ў данясенні да цара. Цікава, што ў апісанні замка няма ні намёку на існаванне ў ім у той час замкавых вежаў (але на планах 1657 г. яны яшчэ былі). Верагодна, іх да таго часу ці ўжо не было, ці яны былі ў напаўразабраным стане. Вежы маглі быць разабраны «маскоўскімі сядзельцамі» для абсталявання сабе печаў у будынках, якіх было каля сотні[14]. Магчыма, іх пачалі разбіраць яшчэ і да гэтага — пасля таго, як горад пакінулі трансільванцы.

Таксама варта адзначыць, што ўвесь замкавы арсенал неўзабаве быў адпраўлены ў крэпасць Глуск Дубровіцкі, на ўсход, бліжэй да тэатра баявых дзеянняў (вернуты ён так і не быў)[15].

Працэс аднаўлення замкавага будаўніцтва, які пачынаўся ў лютым 1667 г., быў зваротнай рэакцыяй на масавыя бясчынствы і рабаванні ў 1665 г. уласных харугваў, якія не атрымалі аплату за службу. У адказ на гэта вялікі гетман літоўскі Павел Ян Сапега 10 кастрычніка 1665 г. адпраўляе ўніверсал паручніку Мсціслаўскага ваяводы з загадам выбрацца з разрабаванага ім горада[16]. Пасля смерці вялікага гетмана Сапегі яму на змену прыходзіць Міхал Казімір Пац, які ў Вільні складае і падпісвае ўніверсал ад 25 студзеня 1666 г. «Пра вызваленне Бярэсця ад ваенных пастояў»[17].

Той жа гетман М. К. Пац 11 лютага 1667 г. у Мінску падпісаў «Універсал пра ўмацаванне горада Берасця»[18]. З гэтага моманту, хутчэй за ўсё, пачынаюцца працы па ўмацаванні і перабудове замка. У наступным годзе складаецца дакумент пад назвай «Рэвізія з інвентаром эканоміі Берасцейскай, Замка, Гарадоў, фальваркаў і ўсёй воласці, да яе належнай, у 1668 г. выкананая»[19], які распавядае нам пра стан спраў, у тым ліку ў замку, праз год пасля пачатку будаўнічых работ. Так, пра замак у ім гаворыцца: *«У тым [замку] няма ніякіх дабротных будынкаў, толькі дзве хаты, у якіх чэлядзь Пана Гараднічага жыве і шопа, дзе гармата ляжыць. Валы, Рундэле, Тайнікі і ўся фартыфікацыя, якая нашымі жаўнерамі і масквой пастаўлена, цалкам валіцца і разбураецца»*[20]. Такім чынам, за

13 Там же. С. 44.
14 Там же.
15 Там же.
16 Там же.
17 Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. Т. 4. Акты Брестского городского суда XVI—XVIII вв. Вильна, 1870. С. 28.
18 Там же. С. 36.
19 *Гладыщук А. А., Никитчик А. Д.* Указ. соч. С. 45.
20 Там же. С. 46.

год у замку не было зроблена практычна ніякіх змен. Заставаліся стаяць нясконачаныя валы, якія будаваліся яшчэ да прыходу Хаванскага, і зробленыя ў 1660 г. пад яго кіраўніцтвам будынкі.

Мабыць, самым інфарматыўным дакументам, які апісвае стан замка ў другой палове XVII ст., з'яўляецца інвентар 1682 г., які мае назву «Замак у горадзе Яго Каралеўскай Міласці Брэсце і горад Берасце»[21].

Для разумення знешняга выгляду і структуры замка канца XVII ст. мы вымушаны забегчы трохі наперад і разгледзець план, копія якога была набыта Іаганам фон Фюрстэнхофам у 1740 г. —план гэты ахоплівае перыяд існавання горада з 1690[22] па 1710-я гг.[23]

У адпаведнасці з гэтымі крыніцамі можна адзначыць, што замак меў пяць асноўных бастыёнаў і шосты дадатковы. Разгледзім іх па парадку. Першы, у паўночна-заходнім куце, трэба меркаваць, быў спраектаваны яшчэ інжынерам Банэлі, яго знешні выгляд і месцазнаходжанне супадае з планам Банэлі. Наступны, паўночна-ўсходні бастыён, больш адпавядае нямецкай школе фартыфікацыі (інжынер Д. Спекле сцвярджаў, што лепшым з бастыёнаў з'яўляецца бастыён з прамым вуглом[24]). Курціна паміж гэтымі бастыёнамі мела пры сабе бруствер.

Для разумення структуры замка варта звярнуць увагу на раскоп, зроблены восенню 2013 г. Пачатак гэтаму раскопу паклаў падпалкоўнік польскай арміі Т. Жук-Рыбіцкі ў 1938 г., які займаўся раскопкамі на тэрыторыі Берасцейскага замка[25]. Перад вайной ён свой раскоп старанна закансерваваў. І вось у 2013 г., ідучы па слядах раскопу 70-гадовай даўніны, археолагі натыкнуліся на знаходку, зробленую Жуком-Рыбіцкім[26]. Гэта была мураваная падпорная сценка — эскарп. Знаходка выклікала бурнае і супярэчлівае абмеркаванне. Археолагі, якія зрабілі гэтую знаходку, сцвярджаюць, што быў знойдзены эскарп, які належаў да Берасцейскага замка. На іх думку, эскарп апраўляў сабой паўночна-

21 Там же. С. 47.

22 *Гладыщук А. А.* Историческая топография Берестейского замка // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. 2011. № 6. С. 52.

23 *Белы А.* Хроніка Белай Русі. Імагалогія Беларусі XII—XVIII стст. Смаленск, 2013. С. 349 ; *Гладыщук А. А., Никитчик А. Д.* Указ. соч. С. 45.

24 *Яковлев В. В.* История крепостей. М. ; СПб., 2000. С. 58.

25 Неизвестные раскопки в крепости Брест-Литовск перед началом Второй мировой войны [Электронный ресурс] // Живой журнал. Блоги. Сообщества. Рейтинги. URL: http://starcom68.livejournal.com/1253861.html (дата обращения: 23.04.2015).

26 Поиски Берестейского замка приостанавливаются. Архив [Электронный ресурс] // TOMIN.BY. URL: http://tomin.by/news/2011—12—02—08—43—09/5472—194 (дата обращения: 15.09.2015).

заходні бастыён (і курціну каля яго). Ён невысокі, і такім, хутчэй за ўсё, быў першапачатковa (што адпавядае тым жа ідэям Спекле[27]). Можна зразумець, чаму эскарп меў невялікую вышыню — з-за адсутнасці гласіса перад замкам каменная абліцоўка павінна была быць нябачнай для праціўніка.

Далей, за другім бастыёнам, размяшчаўся трэці, усходні бастыён. Ён не меў выразнай фігуры. За ім ішоў бастыён у паўднёвай частцы замка. Той меў выразную ромбападобную постаць, але з'яўляўся занадта малым. Далей ішоў пяты, заходні бастыён, размешчаны пасярэдзіне паміж курцін. Ён меў форму квадрата.

Наступны і апошні, шосты паўднёва-заходні бастыён меў выразную структуру і па сваім выглядзе нагадваў бастыён, спраектаваны тым жа Банэлі. Ад гэтага бастыёна ідзе курціна. Заўважым, што на плане Фюрстэнхофа яны маюць абрысы бруствера (не дзіўна, бо прыкрывалі сабой раку Буг, што цякла побач). Каля гэтага бастыёна мелася сажалка (яе таксама малююць на плане ў самім замку, у заходняй яго частцы).

Зараз вернемся трохі назад і больш падрабязна разгледзім інвентар 1682 г.[28] Па інвентары, ад горада ў замак быў пракладзены мост, які стаяў на двух ледарэзах, аднак дылі, размешчаныя ўнізе моста, былі падгнілыя і патрабавалі замены. У мосце паміж ледарэзамі мелася пад'ёмная частка, якая ўзнімалася з дапамогай ланцугоў (яшчэ ў 1566 г. разам з замкавым мостам згадваецца падобны пад'ёмны механізм[29]).

Далей, праходзячы браму, па левую руку можна было ўбачыць «*склепік альбо піўніцу мураваную, падпёртую калонамі, што ператвараецца ў руіну, зверху над шыяй падбітую драніцай*». Тая ж піўніца ўзгадваецца яшчэ ў рэестры 1566 г.

Затым, па правую руку ад брамы, можна было ўбачыць будынкі, якія знаходзіліся пад адным дахам і мелі два вокны. У іх размяшчаліся сенцы і кухня, злева ад якой была камора з пакойчыкам і сенькамі. З правага боку будынка флігелі аселі. Далей размяшчалася хата пад адным дахам, у якой мелася печ, два акна ў пакоі. Дзверы зачыняліся засоўкамі і клямкай. Ззаду гэтага збудавання на другім бастыёне меўся драўляны бруствер, які ад старасці згніў. Далей, па правую руку ад трэцяга бастыёна, мелася жыллё пана гараднічага. Далей ідзе цікавы запіс, на які мы павінны звярнуць увагу: «*В том же обводе окопа, иначе*

27 *Яковлев В. В.* Указ соч. С. 58.
28 *Гладыщук А. А., Никитчик А. Д.* Указ. соч. С. 47.
29 Документы Московского архива Министерства юстиции. Т. 1. М., 1897. С. 444.



*Замка, два хода для вылазок и то заброшенные»*. Можна меркаваць, што пад абводам акопа меўся на ўвазе шосты бастыён і курціна каля яго. Ад таго абводу меліся таемныя лазы да рэк. На тым жа бастыёне «новай фартыфікацыі» цясляр пабудаваў сабе жыллё (халупку). Затым, ідучы да брамы ад чацвёртага (паўднёвага) бастыёна, можна было прайсці побач з «жыллём Генерала Берасцейскага», размешчаным з боку Мухаўца. Пра стан замка далей красамоўна сведчыць запіс: «*Усе валы рассыпаюцца, патрабуючы рэстаўрацыі, каля будынку ляжаць чатыры малыя гарматы, пятая вялікая, шостая таксама вялікая на бастыёне, усе жалезныя без ложаў*». Такім чынам замак знаходзіўся ў вельмі жаласным стане, нягледзячы на тое, што збудаваны ён быў адносна нядаўна апісваемага моманту.

На падставе праведзеных даследаванняў намі створана гістарычная графічная рэканструкцыя замка гэтага часу.

Аднак адыдзем ад дэталёвага апісання замка і пяройдзем да падзей, непасрэдна ці ўскосна звязаных з яго гісторыяй. Горад у XVIII ст. чатыры разы адчуваў на сабе цяжар новых ваенных кампаній, а менавіта ў 1706, 1733—1735, 1769 і 1792 гг. Аднак сапраўдныя баявыя дзеянні закранулі горад у 1792 г.

У сувязі з падзеямі 1769 г. можна прывесці ўспаміны пра замак ураджэнца гэтых месцаў, Ю. У. Нямцэвіча: «*Бесперапынку ганяліся маскоўцы за канфедэратамі, тыя ж, нібы ўяўныя агеньчыкі на балотах, з'яўляліся і знікалі. Берасце, важны пункт па прычыне свайго становішча паміж двума рэкамі, з-за замка, які лёгка можна было яшчэ падняць і адрамантаваць, Берасце, я кажу, ніколі не было без гарнізона, або маскоўскага, або войскаў каралеўскіх*»[30].

Пасля прыняцця ў 1791 г. «Канстытуцыі 3 мая» ў адказ на яе была створана чарговая, Таргавіцкая канфедэрацыя. Яе падтрымлівала Расія, якая распачала з Рэччу Паспалітай вайну. З пачатку вайны войскі ВКЛ у хуткім часе былі вымушаны адступіць на Захад. Для прыкрыцця шляхоў да Варшавы галоўнакамандуючы войскам ВКЛ генерал-лейтэнант Міхаіл Забела адступіў на Падляшша, даслаўшы перад гэтым у Берасце атрад свайго стрыечнага брата, генерал-лейтэнанта Шымана Забелы[31]. Пад яго камандаваннем было 5 тыс. чалавек[32].

Супраць Ш. Забелы на Берасце выступіў рускі корпус пад камандаваннем генерал-паручніка Івана Ферзэна[33]. Высланы Ферзэнам на разведку да Берасця раніцай 23 ліпеня атрад Ланскога збіў перадавыя часткі атрада Забелы і гнаў іх да горада. Падмацаваны генераламі Кнорынгам, Ланскі, пасля штурму фартыфікацыйных умацаванняў і зацятага бою ў горадзе, які доўжыўся на працягу 5 гадзін, узяў яго і гнаў атрад Забелы праз Буг у Цярэспаль. Не ў сілах супраціўляцца рускім войскам, Забела загадаў сваім атрадам адступаць да Варшавы.

Наступныя падзеі (сканчэнне вайны 1792 г. і паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі) Берасцейскі замак не закранулі. Пасля ўваходу Берасця ў склад Расіі ў 1795 г. пачалі складацца планы па ўмацаванні горада. Аднак рэалізаваць іх не атрымалася з-за распачатай у 1812 г. вайны з Францыяй і яе саюзнікамі.

Пасля заканчэння вайны 1812 г. і вайны 1813—1814 гг. праз Брэст, вяртаючыся ў Расію, праходзілі многія часткі рускай арміі. У адной з такіх частак — Іркуцкім гусарскім палку — служыў А. С. Грыбаедаў. Да яго першых літаратурных доследаў адносіцца захапляльна-лірычнае

30 *Гладышчук А. А.* Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі : гісторыка-дакументальны нарыс. Мінск, 2009. С. 46—47.

31 Гісторыя Беларусі. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII—XVIII стст.). Мінск, 2004. С. 241—242.

32 Хронологический указатель военных действий русской армии и флота. Т. 1. 1695—1800 гг. СПб., 1908. С. 200.

33 Там же.

«Пісьмо з Брэст-Літоўска да выдаўца»[34], у якім аўтар дае апісанне Берасцейскага замка і мыса паміж Бугам і Мухаўцам.

Падобныя апісанні могуць дапамогуць нам прадставіць, што з сябе ў той час мог уяўляў замак. Як магчыма пабачыць з апісання, замак захапляў велічынёй сваіх валоў, якія ўзвышаліся над ракой. А. Грыбаедаў заўважыў, што валы зараслі хмызняком і дрэвамі, што сведчыла аб закінутым стане замка.

Наступным, хто пакінуў апісанне замка і горада, быў узгаданы вышэй Ю. У. Нямцэвіч: «*Замак шырокі з чатырма бастыёнамі, цалкам адсыпаўся з зямлі, цалкам спустошаны. Бачныя ў ім толькі развалiны вежы, дзе сядзела прысуджаная шляхта ўнізе, тры пабудовы, і рэшткі накрытых у зямлі труб, альбо вадаправодаў*»[35]. Гэта вельмі важнае назіранне прымушае нас успомніць, што асаблівасцю замка па апісанні яго ў рэестры 1566 г. быў менавіта водаправод — рурмус — праведзены ад Буга, дзе размяшчаўся вадзяны млын, да замка. Па ўсёй бачнасці, роўна праз 250 гадоў пасля складання рэестра рэшткі рурмуса ўсё яшчэ давалі пра сябе знаць.

Пасля заканчэння войнаў пачатку XIX ст. кіраўніцтва імперыі пачало зноў сур'ёзна задумвацца пра ўмацаванні на заходніх межах краіны. І ў выбары месца, прыдатнага для будаўніцтва буйной крэпасці, ізноў быў абраны Брэст-Літоўск.

З гэтай прычыны ў наступныя гады расійскае ваеннае ведамства пачало распрацоўку планаў горада з праектамі будучых крэпасных збудаванняў. Немалую цікавасць уяўляюць план горада 1823 г.[36] і план Опермана 1830 г.[37] На іх можна таксама ўбачыць выявы замка.

Аднак самую вялікую цікавасць уяўляе план, складзены ў 1828 г.[38] Асаблівасць гэтага плана ў тым, што ён дэталёва адлюстроўвае толькі адну частку горада — Замухавечча — а разам з ім і Берасцейскі замак.

---

34 *Грибоедов А. С.* Письмо из Бреста Литовского к издателю («Вестника Европы»). Июня 26-го дня 1814 г. Брест [Электронный ресурс] // Румянцевский музей. URL: http://www.rummuseum.ru/portal/node/1623 (дата обращения: 23.04.2015).

35 *Niemcewicz J. U.* Podroze Historyczne po ziemiach polskich miedzy rokiem 1811 a 1828 odbyte. Paryz, 1858. S. 220.

36 План города Брест-Литовского и местечка Тересполя, 1823. Архив [Электронный ресурс] // ibrest.by. URL: http://www.ibrest.ru/archive/?id=340 (дата обращения: 30.01.2015).

37 Генеральный план укреплений города Бреста. Дата: 1830 г. Архив [Электронный ресурс] // ibrest.by. URL: http://www.ibrest.ru/archive/?id=426 (дата обращения: 30.01.2015).

38 План старинного замка «Брест». Дата: 1828 г. Архив [Электронный ресурс] // ibrest.by. URL: http://www.ibrest.ru/archive/?id=424 (дата обращения: 30.01.2015).







Як ужо адзначалася вышэй, ён з'яўляецца выключна падрабязным. Разглядаючы яго, можна ўбачыць, што валы замка абсыпаліся, згубілі выразную структуру, а шосты бастыён і зусім напалову быў змыты ракою Буг, у выніку чаго яго паўднёвыя фас і фланк абрынуліся. Курціна, якая ідзе ад яго, таксама ўяўляецца значна падмытай. Але, варта згадаць, што замак за гэты час не толькі разбураўся. Пры параўнанні гэтых планаў з планам Фюрстэнхофа можна ўбачыць, што два паўночныя бастыёны, якія выходзяць да горада, былі ўзмоцнены — яны атрымалі насыпы ў выглядзе кавальераў.

Цяпер звернем увагу на збудаванні ўнутры замка. На плане 1823 г. колькасць будынкаў унутры яго тэрыторыі і каля яе складае 9, а на плане 1828 г. іх налічваецца 17 (з іх, мяркуючы па колеры, 9 мелі жылое прызначэнне, а 8 — гаспадарчае). Але якім мэтам яны служылі — невядома.

Па дадзеным плане вельмі зручнай уяўляецца магчымасць устанаўлення памеру замка. Так, М. А. Ткачоў адзначаў: «*Пляцоўка замчышча яшчэ ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. захоўвала выгляд мысавага гарадзішча формы трыкутніка з бакамі каля 234х187х234 м,*

*які аддзяляўся з поўдня дугападобным ровам ад прылеглай тэрыторыі»*[39]. Плошча помніка была крыху больш за 2 га. Калі ж «мысавае гарадзішча» замка разбіць умоўна на дзве фігуры: трохкутнік з бакамі 142х215х142 м і прастакутнік з бакамі 175х78 м, то атрымаем некалькі большую плошчу ў 2,3 га[40].

Звернем увагу таксама на квадрацік ва ўсходняй частцы замка на планах 1823 і 1828 гг. Гэта і ёсць тая самая піўніца, пра якую ішла гаворка ў рэестры 1566 г. і інвентары 1682 г. Яна, у адрозненне ад астатніх замкавых збудаванняў, перажыла ўсе нягоды і прастаяла ў замку да самага канца яго існавання.

Можна дадаць, што на падставе плана 1828 г., а таксама яго дэталёвага аналізу намі была зроблена гістарычная графічная рэканструкцыя замка гэтага часу.

Пасля падаўлення паўстання 1830—1831 гг. рускае кіраўніцтва зацвердзілася з думкай пра неабходнасць узвядзення ў Брэсце крэпасці. Нарэшце ў 1833 г. пачалося яе будаўніцтва, а ў 1838 г. замак быў перабудаваны ва ўмацаванне, якое выступае ў фронт у выглядзе вострага кута, — «кавальер». Неўзабаве ў яго з'явілася ганаровая функцыя — у 1839 г. у кавальеры быў усталяваны флагшток, а 21 траўня 1842 г. адбылося ўрачыстае асвячэнне крэпаснога сцяга і абарончых казармаў[41].



39 *Ткачев М. А.* Указ соч. С. 27.

40 *Гладыщук А. А.* Историческая топография Берестейского замка // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. 2011. № 6. С. 51.

41 *Орлов В.* Берестейский замок и крепость Брест-Литовск [Электронный ресурс] // Живой журнал. Блоги. Сообщества. Рейтинги. URL: http://starcom68.livejournal.com/1113277.html (дата обращения: 30.01.2015).